9. Захаркевич, С.А. Этнические меньшинства на территории Беларуси в XIV-XVIII веках: стратегии культурной адаптации: автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / С. А. Захаркевич; ГНУ Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск 2010. – 17с.
10. Канапацкая, З.И. Татары в Беларуси и их культура (XIV – XVII века) дис. … канд. ист. наук: 08.04.05 / З.И. Канапацкая. – Минск, 2005. – 134, [20] л.
11. Рагимов, А.Н. Миграции и особенности адаптации этнических групп народов Кавказа в Республике Беларусь в конце XX – начале XXI века дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / А.Н. Рагимов. – Минск 2009. – 119, [3] л.
12. Мамаразаков, М.С. Мусульманский культ: прошлое и настоящее (на материалах Узбекистана и Беларуси) / М.С. Мамаразаков. – Минск, 1994.
13. Верашчагіна, А.У. Гісторыя канфесій на Беларусі / А.У. Верашчагіна // Этналогія Беларусі. Традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве / Т.А. Навагродскі [і інш.]. – Мінск, 2009. – 335 с.
14. Архив Института искусствоведения. Этнографии и фольклора им. К. Крапивы Национальной академии наук Беларуси (АИИЭФ НАНБ) – Ф. 6. – Воп. 14. – С. 146
15. Официальный сайт республиканского центра национальных культур [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://centrkult.iatp.by.
16. Блусянкова, І.У. Праблема мовы і культуры караімаў як знікаючага этнаса / І.У. Блусянкова // Фалькларыстычныя даследванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. Вып. 6 / пад нав. рэд. В.В. Прыемка, Т.А. Марозавай. – Мінск: Бестпрынт, 2009. – С. 25 – 29
17. Горский, С.П. Очерки по истории чувашского литературного языка дооктябрьского периода / С.П. Горский. – Чебоксары, 1959.

## ДЭМАНІЧНЫ ПЕРСАНАЖ У СІСТЭМЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ АДНОСІН ПАДЗВІНСКАЙ ВЕСКІ: *БЕЛЯКОЎСКІ ЧОРТ*

***д-р філал. навук, дац. Т.В. ВАЛОДЗІНА***
***(Інстытут мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***

*Аналізуецца комплекс аповядаў і павер'яў, звязаных з выбухам звышнатуральнага ў асобнай падзвінскай весцы, што дало падставы ахарактарызаваць структурныя паказнікі наратыву: цэнтр і перыферыя бытавання, ядро сюжэту і дэталі, ступень міфалагізацыі і «сапраўднасці», роля рэфлексій «ідавочцаў» і слухачоў.*

Інфармацыя пра дэманаў, варажбітоў ды чараўнікоў, як правіла, адносіцца да асабліва займальных палявых запісаў. За знешняй «казачнасцю», сюжэтнасцю і прыцягальнасцю такіх аповядаў за імі не заўседы праглядаюць зусім рэальныя асаблівасці жыццядзейнасці соцыуму ці народнага светапогляду. Між тым такія паведамленні дазваляюць ахарактарызаваць сацыякультурныя адносіны ўнутры самой вескі, пазначыць статус і функцыі асобных яе прадстаўнікоў.

У дадзеным выпадку гаворка пойдзе пра белякоўскага чорта – выбух звышнатуральнага, які назіраўся ў в. Белякі каля сучасных Завадзінаў Лепельскага раена (веска Белякі згарэла ў гады вайны). Інфармацыя запісана на працягу апошніх 5-х гадоў як у самім Завадзіне, так і ў наваколлі радыусам прыблізна 10 км (вескі суседніх Ушацкага і Бешанковіцкага раенаў). На пытанне пра Белякоўскага чорта інфарманты старшага веку рэагуюць вельмі эмацыянальна і актыўна. У большыні выпадкаў аповядам пра белякоўскага чорта папярэднічаюць тыповыя для фабулатаў зачыны тыпу «расказваюць», «казалі», інфарманты з суседніх весак паведамляюць пра блізкае сваяцтва з непасрэднымі назіральнікамі незвычайнай з'явы. Так, пра чорта расказвае бацька інфарманта, сястра, якая была замужам у Беляках і начавала ў той хаце – «*Вот яна станець расказаваць, што ноч не даюць спаць ей, ганяюць. Як выйду, адкрыю дзверы, а яны пад печ. Даўней жа падпечкі былі ў хатах. Цяпер няма. А яны пад печ паўцікаюць*» (7)[111]; жанчына родам з Белякоў, якая часта хадзіла туды на госці, – «*Тут была баба з Белякоў, яна туды хадзіла. Там нейкая радня была. Казала, прышла туды, пабыла з час, пасядзела сколькі. Чапец палажыла, даўней такія чапцы былі. Паеў, паеў, маленькія дзірачкі. А хто паеў?..*» (6); «*Я жыла ў Антунове, там жыла Настася. У Беляках у яе была пляменніца. Расказавала нам*» (10). Аднак, што важна, знаходзяцца інфарманты, якія сутыкнуліся з той гісторыяй наўпрост: «А ці чулі вы пра такія Белякі, што там чорт жыў? – *Эта ж я там жыла. А мы ж былі там адступіўшы, цэлую зіму былі. І бацюшку прывазілі туды*» (3).

**1. Прычыны з'яўлення чорта** (а фактычна парушэнне граніц між светамі, актывізацыя дэманічнага) акрэсліваюцца даволі выразна: праз няўдалае ці незавершанае навучанне чарадзейству, якое само па сабе мяркуе распараджэнне нячыстымі сіламі. «*Яны ўчылісь чаво-та. Ілі ўжо ні давучыліся, каб якую раду даць, штобы*

[111] У дужках падаецца нумар інфарманта, спіс гл. у канцы артыкула. Запісы аўтара.

*зьдзелаць і аддзелаць. Ілі яны каму-та хацелі. Ілі адна адной, непанятна. Вот учыліся і не змаглі давучыцца. І нарушылі яго, разазьлілі. Вот ен як пасяліўся к ім у хату»* (11); «*Дык мая цетка ў Гуськах жыла тут, сюда бліжэ ўжо к нам. А тады ў вайну з Білякоў адступаў той, Базыліха тая, у яе быў мужык Васіль,але яго ўсе Базыль звалі. І вот ен, гавораць, учыўся вродзе чараваць, ды не даўчыўся. Ага. А тады недаўчыўся і вот яго чорт вадзіў. Недаўчыўся, а чорт за ім хадзіў*» (16); «*Ен учыўся чараваць і не давучыўся. Пагэтаму чорт яго, ен пашоў на рыбу, а чорт уцягнуў яго ў лунку і ўтапіў*» (1).

Відавочна, чалавек у сваей няўдалай спробе набыць чарадзейскія веды, а г.зн. статус прадстаўніка «чужога», як бы завісае між светамі, яго ўласны статус становіцца няпэўным і, што вельмі істотна, адкрытым. Такі чалавек ужо не мае паўнавартаснай заслоны ад праяваў дэманічнага і ў той жа час не набывае здольнасцяў кіраваць засветавым суседам.

Матыў «няўдалага навучання чарадзейству» вядомы і ў іншых былічках з Падзвіння. Прыкладам, глыбоцкі Іван, які з чарцямі «зьвязаўся ад дурасьці»: «Мамінага брата быў швагра чараўнік. ... Не, благога ен не рабіў. Ен толькі зьвязаўся з імі ад дурасьці. Як зьвязаўся, дык рады не даў. А благаты не рабіў. Калі насьмешку захочаць зрабіць, дык зробіць. У нас адна дзеўка, ен хацеў ужо яе чапаць, а яна ад яго ўцікала, баялася. Яна знала, што ен вытвараіць. А ен кажаць: «Ну, я ей устрою. Вот будзець вечарына, а яна прынясець вядро пасярод хаты, залупіцца і будзець пісаць». А мама кажаць: «Не нада, Іванька, яна добрая дзеўка, яна цябе баіцца». Дык не рабіў. А дзеўкам казаў: «Зараз дастану з грудзей малака жменю». Дык дзеўкі баяліся, са скуры лезлі. А ен красівы быў дзяцюк» (14).

У якасці прычыны з’яўлення чорта зафіксавана і паказанне на пакаранне чалавека за непачцівы ўчынак у свята, на Вялікдзень – «*Пашоў хазяін у цэркаў, перад Пасхай ілі Ражджаствам, перад якім празьнікам, не знаю. Што там зьдзелаў, наверна, нешта сказаў, і паявіўся чорт у яго*» (4). Семантычна гэты варыянт тоесны папярэдняму, бо і святочны час, асабліва такі сакральна вылучаны, як Вялікдзень, разумеецца ў традыцыйнай свядомасці як час межавы, пераломны, у сваіх структурных і міфалагічных паказчыках роўны часу навучання чарам. І кантакт з засветамі ў спробе атрымаць ведзьмакоўскі дар, і «святое Вялічка» паўстаюць як час адкрытых граніц, тэрмін, што вымагае асаблівай асцярожнасці і пачцівасці ў судакрананні з сакральным і засветавым. Неабачлівыя ж паводзіны чалавека і няведанне ім правілаў, а ўжо тым больш наўмыснае парушэнне законаў вядуць да непапраўна цяжкіх вынікаў. Дастаткова ўзгадаць папулярны на Падзвінні сюжэт пакарання чалавека, які выправіўся на Вялікдзень у поле зваламі араць, за што і быў скараны акамяненнем (гл.вядомыя легенды пра Сцеп-камень ды іншыя камяні-валы).

У той жа час на Падзвінні Вялікдзень нечакана з’яўляецца ў падобным кантэксце, калі дэманічны персанаж помсціць чалавеку, што не схацеў да канца выконваць яго волю, менавіта на Вялікдзень. Так, у Докшыцкім раене чалавек, што вучыўся чараваць, але на паўдарогі збаяўся стрэліць у распяцце Хрыста», стаўся пакараным чортам на Вялікдзень. «…На асіне паявілася распяцце Ісуса Хрыста. І ен яму кажыць: «Бяры гэта руж’е і страляй у распяцце, у Бога». А ен сказаў, той чалавек: «Я, – гаворыць, – ня буду». Спужаўся, як увідзіў гэта. «Ня буду, – кажыць, – не хачу чараваць, вучыцца ня буду». – «Ня будзіш?» – «Не, ня буду». – «Тады на Вялікдзень згарыш». І праўды, згарэў на Вялікадзень. Чэрці дасталі і спалілі яго. Ну, сам не згарэў, а хата. Навучыцца чараваць, будзешь робіць тое, што скажуць» (17).

І яшчэ адзін штрых у пытанні пра прычыны з’яўлення белякоўскага чорта. «Дык можа эта дамавік быў? – *Не, эта не дамавік… А можа і дамавіка нарушылі…*» (11). «Дык дамавік гэта чорт? – *Аняго, ен там чортам абарачаваеца. Там ен арудаваў, а ці гэта праўда ці не. Казалі, Базыль той, дык чорт яго і ўтапіў.* – Ці той Базыль быў чараўнік? Ці памагаў той чорт яму? – *Быццам што-та памагаў. А тады як усердзіцца…*» (6). Прэдыкат «нарушылі», ужыты расказчыцай, усе адно як рэзюмуе глыбінныя падставы актывізацыі звышнатуральнага – яно ўладна пранікае ў чалавечы свет у выніку парушэння: межаў, граніц, нормаў, правілаў, законаў...

2. У пытанні дачыненняў чалавека і дэманічнага персанажа асаблівую выразнасць набывае **аператыўная прастора нячыстай сілы** ў структуры культурнага ландшафту. На прыкладзе лакатыўнасці белякоўскага чорта можна прасачыць, да якіх кропак прасторы ен прывязаны найбольш, дзе цэнтр яго актыўнасці, а дзе перыферыя. Кожная прыватная міфалагічная сітуацыя можа істотным чынам змяняць канфігурацыю карціны свету, у выніку чаго аб’екты культурнага ландшафту могуць мяняць сваю валентнасць, напрыклад, дом – мікракосм, цэнтр свайго свету, раптам стае эпіцэнтрам чартовых пахаджэнняў. Месцам прытулку белякоўскага чорта адназначна падаецца печ. У цэлым гэта зусім заканамерна, бо сама печ асэнсоўваецца як самы выразны медыятыўны локус, з іншага боку, менавіта за печчу замацоўваецца месцазнаходжанне дамавіка. «*Як выйду, адкрыю дзверы, а яны пад печ. Даўней жа падпечкі былі ў хатах. Цяпер няма. А яны пад печ паўцікаюць*» (7). «*Гавораць, чорт к ім прыйдзець у хату, на печ залезець, кірпіч дзержыць і кідаець на іх, а яны ня відзюць*» (14). Учынкі Белякоўскага чорта з комінам у гэтым кантэксце таксама не падаюцца жартам: «*Купілі бальшый платок, даўней такія вот рабят абкрывалісі і насілі перад сабой бабы, калі малыя дзеці куды йці. Ага. Купіла яна бальшы платок і палажыла, як даўней сындукі для адзежы былі. (...) А тады затапіла, назаўтра печ тапіць, увесь дым на хату йдзець. Тады, што такое? Базыль ейны палез аж на гэту крышу, у трубу, аж платок гэты апынуўся ў трубе, труба заторкнута*» (16).

Цікава, у былічках з Падзвіння ў печы чэрці нават ладзяць свае ігрышчы: «Ен быў чараўнік. А тады да мамы: «Так, Віля, павыкідай катлы з печы, там будзець вечарынка». І так іграюць, танцуюць у печы, ай-ай. А як кінеш палку туды, як вурнець адтуль, гэтая палка і выскачыць. Ен рабіў гэдак. Чараваў, чарнакніжнік быў. І сядзіць, кажаць, гэдак відна стала ў комнаці. «Гляджу, – кажаць, – з аднаго угла лезіць здаровы, вялікі, а з другога меншыя». І ідуць да яго. «А я, – кажаць, – за качаргу: «Ах вы! Дык вас Іван прыслаў? А яны назад у куткі і палезьлі». Гэта чэрці. Чэрці былі. Таўстыя. Гэткія, як чалавек. Хвост на плячы закінуты» (14).

Як і належыць, хатняму чорту пад прытулак адводзіўся качарэжнік, дзе і разгортваліся яго рознага роду дзеі: «*Мусіць, іх ня відзілі. Казалі, што пад печчу былі. Што з падпеччака як вецер які як узьнімецца і тады там усе верадуіць*» (12). Актуалізацыя качарэжніка ў дадзеным выпадку толькі ўзмацняе магчымае суаднясенне Белякоўскага чорта з дамавіком.

Заканамернай падаецца і традыцыйная замацаванасць хатняга чорта з агнем (што судачыняецца і з сэнсавай сувяззю чорта з печчу) – «*Дзядзька яшчэ казаў, абы-што робіў, галавешкай з агнем па страсе качаецца. Здаецца ім так, што галавешка па страсе качаецца*» (9). Наогул, сэнсавая повязь дэмана з галавешкай падаецца ўстойлівай і знаходзіць свае выяўленне ў розных жанрах фальклору. Недалека ад Белякоў, у в. Зямцы Лепельскага р-на, гэтаксама расказвалі пра чарцей, што жылі ў хаце. Дык і яны «*адзін раз што зьдзелалі, гаварылі. Галавешкі з печы ўсе павыкідалі на хату. І галавешкі, і вугальля, і дровы, усе выгрузілі на хату. А ці гэта праўда?..*» (7).

З іншых штрыхоў лакатыўных праяваў чорта вылучаюцца паказанні пра яго з'яўленне на страсе, на варотах, што зусім арганічна з прычыны іх межавага статусу. «*Дзядзька расказаваў, ці праўда ці не, алі казаў, сам відзіў, як ен сядзіць на варотах*» (9). Такая лакатыўнасць дэмана з'яўляецца звыклым элементам у былічках, бо межавасць варотаў семантычна стасуецца з дэманічнай прыродай чорта.

Такім чынам, катэгарычна вылучаецца суаднесенасць: чорт / печ – агонь – дамавік, ці неадпаведнасць першага «мінусовага» складніка семантычна неадназначным агню і печы, медыятыўнасць якіх на персанажным роўні ўвасабляе хатні дэман. Патранажна-апякунчыя функцыя дамавіка ў перапляценні з яго рэгулятыўным прызваннем, роляю «наглядальніка» за парадкам у хаце мусіла б проціпастаўляць яго чорту па лініі дамавік – «добры», чорт – «дрэнны». Але хатні дэман у полі сваей семантыкі змяшчае даволі важкі складнік – ен энергетычна ўвасабляе насельнікаў хаты, кандэнсуе іх персанажны тып, нездарма ў павер'ях дамавік падобны да гаспадара. Такім чынам у «белякоўскім тэксце» з'яўляецца наступная сюжэтна-тэматычная лінія: **чорт – гаспадары**.

3. Большасць інфармантаў сходзіцца на тым, што чорта прынесла з сабою жонка, якая выйшла ў гэтую хату замуж. Жыхары суседняга з Белякамі Завадзіна падрабязна расказваюць пра гаспадыню, Кацярыну, і яе сваякоў: «*Вот тая Кацярына жыла ў Гаравых, а ен у Беляках. І ен жаніўся, барадаты, стары стаў, так, на ліцо красівы, а то апусьціўся. І яе ніхто не браў замуж, што яна знала чаруваць. Дык у Беляках не было чорта, а як яна прышла, дык і чорта прынесла. А яе ніхто не браў замуж, хоць і красівая была, а за яго ніхто ня ішоў, што ен такі касматы быў*» (8). Такім чынам, чорт быў супольнікам гаспадыні, у белякоўскай хаце з'явіўся фактычна «ў прымы», захаваўшы свой капрызны нораў. Пры тым, што гаспадыні дапамагаў, патрабаваў, каб усе ішло «па-ягонаму», інакш адкрыта бунтаваў: «*Наверна, яна была якая-та калдуньня. Знала. Ні ў каждага ж чалавека чэрці бываюць. Хто ні знаіць, к таму яны ня пойдуць.* – А ці той бабе чорт памагаў? – *Яна казала, што ей памагаў. Памагаў тэй бабі. А калі ўзлуіцца, усе паразносіць, калі яму там супярэчуць ці што. Ці ні па-ягонаму скажуць. Тады, кажаць, усе парассапаіць, і крупы. Раньша ж крупы таўклі ў ступы. Усе, гаворыць, паразьбіваіць, парассапаіць. А нада, гавораць, што і пасобіць. Што якоя і дзелаў*» (12). І толькі ў весках, найбольш аддаленых ад Белякоў, фіксуецца ведзьмакоўскі статус гаспадара.

Адметна і тое, што інфарманты апісваюць гаспадароў з той сялібы, дзе пасяліўся наш чорт, у тыповых характарыстыках, уласцівых медыятарам ці прадстаўнікам засветаў. Гэта або дэвіяцыі знешнасці, або, надварот, гіпербалізаванасць «станоўчага». Так, для гаспадыні неаднаразова падкрэсліваецца яе прыгажосць, багацце (па сялянскіх мерках) і ў той жа час бяздзетнасць, якая ў традыцыйным соцыуме ўважалася як пакаранне за грахі: «У іх рабят не было. А ен яе багатую ўзяў, яна і красівая і багатая» (8). Гаспадар жа вылучаўся празмерным аваласеннем, што наогул у вачах традыцыйнай супольнасці раўнавала яго да нячыстага: «І ен жаніўся, барадаты, стары стаў, так, на ліцо красівы, а то апусціўся … а за яго ніхто ня ішоў, што ен такі касматы быў» (8).

Такім чынам, названая вышэй супярэчнасць чорта – дамавіку (=гаспадарам) здымаецца адпачаткова дэманічным, чарадзейскім статусам гаспадароў. Дэман становіцца своеасаблівым працягам гаспадароў, нават пераймае іх справы. Ці мо перадае ім свае здольнасці, як сталася з вельмі паказальным талентам Белякоўскага чорта. Самым адметным штрыхам яго партрэта была цікаўнасць да кравецкае справы. У расказах, краўчыхай была гаспадыня чорта, прычым краўчыхай добрай, да яе прыносілі шыць вяскоўцы. Дык чорт паводзіў сябе тут даволі выбарачна, часцей тканіну заказчыкаў не чапаў – «*Чорт у нас гаворуць, быў у Беляках. Дзядзька гаварыў: яна шыла, Кацярына тая, дык гаворыць, прынясець хто шыць, казалі, праўда было. А ці яно праўда было ці не, дык гэту адзежу ен пастрыжэць. Ну там пакусаіць, ці што там здзелаіць. Гэта іхнаю. А чужую не чапаў*» (9); «*Прынясуць шыць мацір'ял, а жонка партніха была, Базыля, Базыль жыў. А ен тоя, чужоя ня трогаў, ня трогаў, а свае парэжаць*» (1),

хаця мог і сцягнуць («*У нас некаторыя насілі туды шыць, дык казалі, што ен тыя кускі сьцягаваў*» (12)) або нават папсаваць – «*Расказавалі, занясуць там, бывала, адзежу шыць, а ен тады, гаворуць, папарвецъ, папарвецъ увесь мацер'ял на кускі. Яна шыла, тая баба, у каторай ен жыў. Эта ж ні цяпер, што ўсе гатовая, раньшы ж шылі. Яна говораць: узлуіцца і ўсе папарвецъ на кускі. Прыдуць, а ен усе папарвецъ, папарэжаць на кускі*» (12); «*Жана яго была партніха, а ен ей парэжаць, парэжаць усе.* – Людзі прынясуць шыць, а ен парэжаць? – *Ага, узлуецца на яе*» (4).

Сюжэты пра незвычайных краўцоў ці шаўцоў вельмі распаўсюджаныя ў еўрапейскім фальклоры, яшчэ са збораў братоў Грым вядомыя казкі пра маленькіх краўцоў, што дапамагалі бедняку. Беларускай і літоўскай традыцыям уласцівы шэраг паданняў, сюжэт якіх зводзіцца да таго, што ў камені жыве незвычайны майстар, за пэўную плату ен спраўна шые адзенне ці абутак. Паданні настойліва атаясамліваюць міфічнага майстра з хтанічным персанажам – перш за ўсе з чортам, радзей са змеем. «Нахадзіўся ў тым камені чорт, нячыстая сіла. Паднасілі яму шыць. Як скажуць: «Пашый харашо», то ен якую штуку ўклеіць. А як: «Пашый, пажаласта, як сам знаеш», – адчаканіць харашо. Ці кажух ці што. Сівы камень. Там змей нахадзіўся ў камні. Врэд ня дзелаў. Падыдзі, скажы, вот забылася, як звалі, каб пашыў. Адкрываецца акно… і бярэць, і закрываецца» (18).

Дзеля аб'ектыўнасці, няма згадак пра наўпроставыя кравецкія здольнасці нашага чорта, але ўключанасць яго ў працэс шытва і неабыякавасць да занятку гаспадыні не выклікае сумненняў і не можа быць выпадковай.

**4. Акцыянальны рад** у этнакультурным партрэце Белякоўскага чорта, як і яго аблічча, выглядае цалкам традыцыйным. Яму прыпісваліся тыповыя ў вясковым асяроддзі дэструктыўныя дзеі, шкодніцтва, недзе нават жартоўныя выбрыкі, накшталт таго, што неаднаразова вытвараліся ў купальскую ноч звычайнымі хлопцамі – «*І качалкамі білі. Стукалі. І палкамі. І дажа што, гаварылі, печ затопіць, а яны трубу закрыюць, і дым ня пойдзіць. Курна тапілі печ. Гэта чэрці – тожа страшна. Ага, казала, што на ноч усе пазакрываем, пазамыкаем, прачыхаемся, а ўсе хлявы раскрыты. Скаціна на двары. У той хаце, дзе жылі*» (7); «*Шкодзіць шкодзіў, то тоя, то тоя. Не чапаюць што, а ен разрыіць. Мяхі нейкія, ці там бульба, ці ячмень, што там было, а ен рассыпаў яго і ўсе. А якую ен меў сілу рассыпаць? Яго нідзе не відаць, а ен рассыпіць*» (8). «*Прыду к ім. А яны есці варуць. А тыя накладуць ім у катлы палак.* – Тыя чэрці? – *Да, у яду. Кажуць, вынюць, а там есьці нечага*» (10).

Ад даволі бяскрыўднай сваволі – «*Да, да, мама расказавала. Неяк адзеяла сьцягаваў, хоць і ляжаць удвух усераўно*» (5) – чорт пераходзіў і да даволі небяспечных учынкаў: «*Здаваліся зданькі ў тым доме. Казалі, што і жыць там неяк. І ганяць яго, і душыць*» (3). Запісаны ў тэксце белякоўскага чорта і тыповы для чараўнікоў па ўсей Беларусі штрых: «*Вот у іх такоя было, што масла саб'юць, а эта масла возьмуць, з навозам зьмішаюць*» (2). «*Там праісхадзілі ўдзівіцельныя вешчы. Раньшы былі кросны ткалі. Вот была ўжэ пааставаныя кросны і вынесеныя на прасушку. І ножніцы ходзюць самі, відзюць, ножніцы ходзюць сабе. Ні чалавека нідзе нікога нет, а ножніцы ходзюць сабе, пстрыкаюць, рэжуць ніткі. Што эта праісходзіць? А ім голас, нявідзіма хто, а голас ім: Эта вам за то, што вы на мяне кляўзьнічаеця, нагавараваеця*» (2).

Чарцям прыпісваліся тыповыя гукавыя паводзіны – празмерны смех: «*Многа іх. І хахаталі там між сабой. Як рассмяюцца, дык каб і спаў крэпка, усе роўна разбудзюць*» (7) або проста грукат – «*Яны яго ня відзюць, а яно грымела, стучэла, гаворуць*» (12); «*Яна казала, мы ж яго ня відзілі, ні знаім. Вот есьлі прыдзіш туды, а яна яго ўгнявіць чым, хазяйка, ен будзець хадзіць, ляпаць, стукаць, ляскаць. Уся хата хадуном ходзіць. Мы, кажаць, сядзім, баімся, эта ўсе Вольга расказавала. Кажаць, сядзім, баімся, а тады бяжым бягом, каб чорта гэтага ня ўвідзіць*» (12).

Да асабліва дзіўных гукавых праяваў белякоўскага чорта можна аднесці звон пілы: «*І вот этага чалавека харонюць (гаспадара, якога ўтапіў чорт.* – Т.В.*). У хату прынясьлі яго, ужо ўсе. Ужо надзелі, усе, на куце ляжыць. Прыгласілі папа, ужо адпяваць этага ўтопшага, памершага. І вот поп ужо моліцца. І ў эта ўрэмя із-за печы ляцяць, адзежа ляціць із-за печы, што там яшчо, пясок, каторы засыпаўся за печ. А бабулін дзядзька быў масьцер, із пілой, грабы дзелаць. Прышоў ен там, павесіў пілу ў трысьцені што лі. Эта піла звініць, як па ей б'ець хто. Не відаць нікаво. А вот такоя праісходзіць*» (2). У запісах з іншых весак Падзвіння звон пілы чуецца ў хаце, дзе нібыта з'яўляліся зданькі: «Чула я пра Дамавіка Вот на гэтым месцы, дзе стаіць наш дом, раней стаяў стары, Яго ў вайну спалілі. Ен быў з прысценкам, вось у ім жылі зданькі. Раз ад разу чулі нібы звукі пілы, аднойчы бульба летала па хаце» (19).

**5. З мінісюжэтаў «белякоўскага» тэксту** вылучаецца аповяд пра намаганне пазбавіцца ад нячыстай сілы праз зварот да царквы і свяшчэнніка. «*Дык і пасьвіцалі яны, і ў цэркаву хадзілі. Дык я ня ведаю, ці яно там палуччала*» (3). Ну і візіт святара апісваецца як міфічны двубой, дзе вычмурэнням нячыстага процiпастаўляецца малітва, але перамога аддаецца ўладнаму насельніку дома. «*Ага, балталі там яшчэ такую ерунду, што прывязьлі бацюшку там, ці папа, а ен ужо службу начаў, так балталі, службу. Каб ужо выгнаць таго чарта. Пакуль ен там маліўся, крысьціўся, а ен яму там рызу парэзаў*» (13). «*А тады кажаць, прывязлі папа, а поп стаў маліцца. Ну, спяклі яешню ўжо папу, а ен, гаворуць, з качарэжніка, з печы, галавешку ў скавароду*» (9).

У адным з запісаў на месцы свяшчэнніка з'яўляецца ўраднік, але вынік яго візіту той жа – ганебныя ўцекі. «*Папа расказаваў, сядзіць хто ў хаце, а комін, кірпіч ляжыць, а адтуль сыпецца, сыпецца на зямлю. Ну, што дзелаць. Яны нейкага ўрадніка, эта цяпер міліцыянеры, а тады ўраднік, эта ж яшчэ да*

*вайны. Паехалі, прывязлі таго ўрадніка, у яго полы длінныя, яго ж на кані прывязлі, машын жа тады не было. А ен стаіць, а кірпіч сыпецца перад ім. А тады пачка табакі стаяла там на стале, цэлая стаяла, узяла і звалілася на зямлю. І табака рассыпалася. А чалавека німа. Эта чорт так кіруваў. І вот той ураднік прыехаў, стаіць, а тут сыпіцца з печы. А тады палядзіць, а ў яго ўся пала дзіркамі пакручана. А-яй. Ен тады шапку ўвахапку і з хаты. Уцякаць ад іх. Па другіх хатах хадзіў і выспрашаваў»* (8). «*І тады як ен урадніка, даўней гаварылі урадніка прывеў, не міліцыю – урадніка. А чорт: «Ха-ха-ха! Урадніка прывеў. Усе раўно буду датуль хадзіць, пака Базыля не ўтаплю*» (16).

Пэўныя сацыя-гістарычныя рэаліі адбіліся ў такой акалічнасці, як намер гаспадароў уцячы ад чорта – у Сібір: «*Відзюць, што дзела драно. Той Базыль кажаць: «Баба, нада ў Сібір уцікаць». А ен (чорт) на печкі сядзіць і гаворацца: «Я за вас раней буду там, у Сібіры*» (1); *Во гэта сям'я, яны хацелі ўжо ў Сібір выязджаць. А ен сядзіць у чалесьніку і кажаць: Куды вы не паедзеце, а я ўперад за вас буду. Уперад за вас заеду ў Сібір. Я вас і там найду*» (15); «*Вот рашылі яны выехаць з Белякоў, тут ім ужо жызні нет. Паедуць у Сібір. А ім з-за печы атвечаюць: Пакуль вы будзеця ехаць, я ўжо буду там. А хто атвечаець – не відаць нікаво*» (2).

**6. Лакальная характарыстыка сюжэта**. Чым далей ад Белякоў, тым большая варыятыўнасць у дэталях апавяданняў пра чорта. Прыкладам, у падрабязнасцях смерці гаспадара. «*Ну а тады ен, гэтый Базыль, пайшоў на рыбу. Зімой лумачку такую праб'ець, абы рыбінку выцягнуць із вудачкай. Ага. Ну, пашоў рыбу лавіць, нашлі Базыля ля лумкі, утопленага! А ен яго, мусіць, туды ўжо мордай у гэту лумку, ен захлебнуўся. І ўсе. Кала лумкі, кала лумкі кала гэтай, гавораць, нашлі яго нежывога, Базыля гэтага*» (16). Так, на месцы лункі, у якую ўтапілі дзеда, можа з'явіцца калодзеж – «*А тады дзеда таго ні стала. Вродзе ў лунку ўтапіў таго дзеда. Ці ў калодзеж*» (4) ці палынння – «І ўтапіў чорт не мужа вядзьмаркі, але яго брата: «І брат яго – Іван звалі. Пашоў рыбу вудзіць і там палынння была, во ў возеры, дзе я ваду бяру. Ен уваліўся ў палыньню і толькі шапка плаваіць. А яго німа. А усе кажуць, што эта яго чорт упіхнуў. Ен ба сам не пашоў у палыньню, разумны ж. (…) Эта чорт так кіруваў. Эта чорт той, кажуць, Івана таго ўпіхнуў. Пасварыліся яны з той Кацярынай, зь яго братоўкай, вот яна яму зьдзелала. Усе казалі, што ўпіхнуў маладога. А ен малады і красівы быў. Яшчэ не жанаты быў. Казалі, толькі чорт упіхнуў» (8). Паказальна, чорт помсціць чалавеку, што не дагадзіў яго гаспадыні.

Удакладняецца, што цягнулі Базыля да лункі задам – «*А як яго там звалі, хазяіна гэтага, утапілі, зімой. Цягнулі да лункі задам, сьляды задам былі, і ўтапілі*» (11), што ў традыцыйнай свядомасці маркіруе якраз шлях на той свет. І ўжо зусім паказальны штрых – мертвага ведзьмака Базыля чорт садзіць у дзяжу: «*Базыль гэты, гаворуць, знаў, гулдуваць там ці што. Дык гаварылі, што яго ў лунку ўтапіў чорт. Прышлі, а яго ў дзяжэ ў хлебніцы прынес эты чорт, у дзяжу ў хлебніцу.* – Дык хто яго ў дзяжу ўсадзіў, чорт? – *Да.* – Ужо мертвага? – *Ен утапіў яго ў лумцы, у азярэ, зімой. Ну, яго схаранілі, усе, а тады паглядзяць, а ен у дзяжэ.* – Ужо пасьлі таго як схаранілі? – *Да, як схаранілі. А ці праўда ці не*» (9).

Як правіла, аповяды пра шчыльнае супрацоўніцтва чалавека з чарцямі заканчваюцца паведамленнем пра яго пакутлівую смерць. Побач з вельмі папулярнымі пераказамі гісторый, як «чараўнік цяжка паміраў», сустракаюцца і выпадкі, калі чэрці душаць свайго «гаспадара» (які насамрэч станавіўся рабом нячыстай сілы) з-за адсутнасці працы. «А ен (брат-чараўнік) расказаваў мамі: «Як прычэпюцца, каб работу даваў. Дык насыпець у попел мак, каб выбіралі, ці ваду ў кулі вязаць. Ну дзе ж яны ваду павяжуць. Кажаць, змочуцца, здушуцца, тады адчэпюцца. Рады не было». Алі беднага яны яго задушылі, павесілі. Чорты гэтыя» (14).

Для любой з этнакультурных лакальных з'яў вылучаюцца цэнтр і перыферыя: цэнтр як месца асаблівай шчыльнасці, падрабязнасці і падобнасці запісаў і наваколле, калі пачынаюць назірацца адступленні напачатку ў дэталях, а затым і адносна ядра сюжэту. Разам з тым па меры аддаленасці ад цэнтру ўзрастае ступень міфалагізацыі, аповяды ўсе больш суправаджаюцца заўвагамі тыпу «А ці праўда ці не», «Нешта такоя чула» і г.д. Цэнтр жа з'явы, як правіла, перадае інфармацыю як у вышэйшай ступені даставерную, рэспандэнты апелююць да ўласнага досведу.

Варта агаварыцца, што па меры аддаленасці ад цэнтру назіраецца спрашчэнне асноўнай сюжэтнай лініі, самі персанажы набываюць больш акрэслены і адназначны статус. Так, у Завадзіне падрабязна апавядаецца пра сям'ю, з тымі дэталямі, што партнёхай была сястра гаспадара, а ў лунцы ўтапіўся яго брат. Сама іх смерць падаецца даволі празаічна: гаспадыня памерла, а Базыль згарэў у вайну, як палілі веску. Чым далей ад цэнтру, тым больш лес гаспадароў апісваецца па законах міфалагічных жанраў – краўчыха была сама чараўніца, а чараўніка ўтапіў не хто іншы як чорт. Іншыя члены сям'і проста ігнаруюцца, або развіваецца дадатковая лінія, як гэта атрымалася з пляменніцай Варкай: «Ну, эта Варка, у яе ў Гаравых кала нас была сістра родная замужам. Яна свае забрала ўсе, і скрыню, і прывезла ў Гаравыя, ужо зьберагаць сваю адзежу. А тут, як прывезла скрыню, ноччу. Яшчэ як быў хазяін яены, тады ж было курава ў такіх во кісеціках, там камянек, гікала, ваты кусочак, табак і ўсе гэта ўмесьці. Лег спаць вечарам і ўсе гэта палажыў на стол. Толькі началі драмаць, эта ўсе праз акно як паляцела. Акно вон, і эта апынулася аж за дарогай. У вагародзе. Назаўтра вышаў, у гародзе нашоў. А тады Прасіньня, сістра, быстранька ў Бялякі. – Забяры свае ўсе, штобы нас не трывожылі. Забрала яна. Забрала, тут ужо, у Гаравых нічога, а там а што яны дзелалі, не знаю, якую яны там раду далі» (11).

У фальклорна-этнаграфічнай літаратуры не сустракалася так шчыльна інфармацыйна насычанага блоку вераванняў пра пэўны феномен. Што не дазваляе, аднак, сцвярджаць унікальнасць нашага белякоўскага чорта, бо яго партрэт складваецца з вядомых па іншых крыніцах семантычных рысачках. Хутчэй гэта толькі штуршок да актывізацыі збіральніцкай працы ў кожнай весцы Падзвіння.

ІНФАРМАНТЫ

1. Асташка Мікалай Міхайлавіч, 1937 г.н., в. Наваселкі Ушацкага р-на. Запісы аўтара. У далейшым гэтаксама запісы аўтара, калі іншае не агаворваецца адмыслова.
2. Волкаў Федар Пятровіч, 1934 г.н., в. Суша Лепельскага р-на.
3. Галай Ганна Пятроўна, 1916 г.н., в. Заручаўе Бешанковіцкага р-на.
4. Даніленка Петр Васільевіч, 1928 г.н., в. Турасполле Ушацкага р-на.
5. Ерашэўская Лідзія Піліпаўна, 1921 г.н., в. Заезвіння Бешанкавіцкага р-на.
6. Жагала Ніна Сцяпанаўна, 1919 г.н., в.Нізгалава Бешанковіцкага р-на.
7. Ліцвін Варвара Лаўрэнцьеўна, 1927 г.н., в. Кугоні Ушацкага р-на.
8. Маляўка Ганна Сцяпанаўна 1930 г.н., в. Завадзіна Лепельскага р-на.
9. Маціеўская Мая Рыгораўна, 1930 г.н., Сокарава Бешанковіцкага р-на.
10. Недбальская Марыя Міхайлаўна, 1931 г.н., в. Кугоні Ушацкага р-на.
11. Піскунова Валянціна Пятроўна, 1936 г.н., в. Пола Ушацкага р-на, да 1967 года жыла ў Гаравых Лепельскага р-на. Зап. Валодзіна Т., Лобач У.
12. Саўковіч Надзея Канстанцінаўна, 1926 г.н., в. Кугоні Ушацкага р-на.
13. Шуманскі Дзмітрый Аляксандравіч, в. Суша Лепельскага р-на.
14. Талкач Арцемія Сяменаўна, 1933 г.н. і Карзевіч Кацярына Сяменаўна, 1922 г.н. у в. Сарокі Глыбоцкага р-на.
15. Буржынская в. Завадзіна Лепельскага р-на.
16. Смай Аляксандра Міхайлаўна, 1924 г.н. (нар. у в. Наваселкі), в. Залужанне Ушацкага р-на. Зап. Бабіча.
17. Скурат Соф’я Пятроўна, 1926 г. н., в. Рачныя Докшыцкага р-на. Зап. Кавалева І. і Лупенько Т.
18. Кудзерка М. З., 1920 г.н., в. Міхалова Лепельскага р-на. Архіў Студэнцкага этнаграфічнага таварыства: зап. у 1998 г. Глушко А.
19. Татарынава Любоў Іванаўна, в. Стралкі Верхнядзвінскага р-на. Зап. эксп. ПДУ у 1995 г.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД. Грант «Наука (НАНБ-вузы) – 2011» Дамова № Г 11ОБ-023

## ЗАНЯТКІ НАСЕЛЬНІЦТВА І ВЫТВОРЧА-ПРАМЫСЛОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ ШУМІЛІНСКАГА РАЕНА (ПА ДАДЗЕНЫХ ТАПАНІМІІ)

***В.А. ЕЗАВІТАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Исследовано распространение топонимов, которые отображают занятия жителей и производственно-промышленное направление деятельности населения Шумилинского района. Представлены итоги полевых исследований, проанализированы топонимические, этнографические и исторические материалы. Более пристальное внимание уделяется названиям промышленного характера, лесохимической обработки, месторождений сырья, а также названиям, связанным с профессиональными качествами человека.*

Сярод тапонімаў вылучаецца катэгорыя, якая падае інфармацыю аб дзейнасці жыхароў. З гэтай группы вылучаюцца асобныя галіны, якія адлюстроўваюць заняткі насельніцтва, промыслы і прамысловую вытворчасць.

Галоўнай мэтай артыкула з’яўляецца вывучэнне заняткаў і вытворча-прамысловай дзейнасці насельніцтва ў межах Шумілінскага раена па дадзеным тапанімічнага, этнаграфічнага і гістарыяграфічнага аналізу. Гэта дазваляе даследаваць сетку вытворчых прадпрыемстваў і прааналізаваць развіцце здабываючай галіны прамысловасці.

Паляванне з’яўлялася адным з найбольш важных відаў промыслаў чалавека. Для рэк характэрны гідронімы, атрыманыя ад назваў жывел, на якіх палявалі людзі: р. Выдрыца (левабярэжны прыток р. Обаль), р. Баброўка (левабярэжны прыток р. Будовіца).